View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Сустрэча, натхнёная словам

**У той сакавіцкі дзень, калі рэдкалегія часопіса “Роднае слова” выступала перад студэнтамі і выкладчыкамі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, на небе з’явілася вясёлка. Як сімвал вясны, абнаўлення, надзеі, якія асабліва выразна сінанімізуюцца ў кантэксце творчага жыцця.**

Сустрэча, натхнёная Словам. Сустрэча-споведзь, прасякнутая самымі запамінальнымі колерамі вясёлкі. Якімі ж?

**Колер чырвоны.** Напачатку перад студэнтамі і выкладчыкамі выступіў загадчык кафедры беларускага мовазнаўства, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Павел Міхайлаў, які пазнаёміў з гісторыяй стварэння часопіса, тэматыкай яго асноўных публікацый, вядомымі беларускімі лінгвістамі – аўтарамі “Роднага слова”. Выступоўца зазначыў, што гэты год знамянальны для часопіса: яму споўнілася 20 гадоў. А фактычна выданне вядзе свой пачатак з 1987 года, з часопіса “Народная асвета”, у якім існаваў раздзел “Беларуская мова і літаратура”. Цікавасць да яго публікацый расла. Неўзабаве ўзнікла ідэя заснавання асобнага выдання. Яе падтрымала Міністэрства адукацыі Беларусі, і ў студзені 1988 года выйшаў першы нумар часопіса “Беларуская мова і літаратура ў школе”. А ўжо ў 1992 годзе ён займеў новае імя – “Роднае слова”. Роднае – бо ад шчырых крыніц беларускай душы, роднае – бо выспела на гуках матчыных калыханак, найлепшых радкоў пісьменнікаў, прачулых песень.

**Колер зялёны.** Вядома, што ён жыццесцвярджальны, аптымістычны. І такім – жывым, дынамічным, яркім – было выступленне галоўнага рэдактара “Роднага слова” Уладзіміра Куліковіча. Ён падзяліўся планамі рэдакцыі, распавёў пра новыя рубрыкі выдання і пазнаёміў з членамі рэдкалегіі. З ягоных слоў многія даведаліся, што часопіс штогод плануе выдаваць 3 – 4 тэматычныя выпускі на аснове матэрыялаў, якія змяшчаліся ў ім або яшчэ знаходзяцца ў рэдакцыйным партфелі. Ужо выйшла першая кніга такога кшталту – бібліяграфічны паказальнік “Беларускія пісьменнікі на старонках часопіса “Роднае слова”. У планах рэдакцыі – выданне другой кнігі, прысвечанай жыццёваму і творчаму шляху В.Дуніна-Марцінкевіча. У ёй будуць змешчаны артыкулы, якія на працягу 20 гадоў друкаваліся ў часопісе і якія рыхтуюцца да друку, а яшчэ матэрыялы роднасловаўскіх аўтараў, апублікаваныя ў вузкаспецыяльных зборніках. Застаецца толькі пасябраваць з “Родным словам” і падтрымаць выданне актыўнай падпіскай. Прычым можна стаць не толькі чытачом, але і аўтарам часопіса. І не важна, хто – выкладчык або студэнт – будзе гэтым аўтарам. Галоўнае – не застацца толькі сведкам цікавых падзей, галоўнае –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паспець прааналізаваць, напісаць і падзяліцца з любімым выданнем сваімі думкамі і пачуццямі.

У сваіх выступленнях члены рэдкалегіі Людміла Бохан, Дзмітрый Літвіненка, Ларыса Сагановіч, Наталля Шапран, Надзея Бышка расказалі пра змест цяперашніх і плануемых рубрык часопіса, а таксама пра найбольш актыўных аўтараў роднасловаўскіх публікацый.

Затым госці адказалі на шматлікія пытанні студэнтаў.

**Колер блакітны.** Гэты колер асацыюецца з марай і паэтычным натхненнем. Яны – нязменныя спадарожнікі дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства, кандыдата філалагічных навук, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Міколы Шабовіча, вершы якога часта друкуюцца на старонках “Роднага слова”. Напэўна, ніводнай творчай вечарыны немагчыма ўявіць без дасціпнага і ўсмешлівага Міколы Шабовіча. Ягоныя вершы маюць невычэрпны патэнцыял энергіі. Светлай, як вясновы ранак, і шчырай, як першае каханне. “Як на цябе, я, мабыць, не глядзеў...” – прагучалі першыя радкі паэта. Радкі, адрасаваныя кожнай студэнтцы, кожнай выкладчыцы. Прынамсі, хацелася ў гэта верыць. А пасля паэзія Міколы Шабовіча набыла асаблівыя адценні – індывідуальныя, непаўторныя – у галасах спевакоў Дзмітрыя Пятровіча, Анатоля Міхальчэнкава і Кацярыны Сапожнікавай.

Песня “Падары мне сваю адзіноту”, якая завяршала сустрэчу, нібы зноў нагадала пра важнасць сяброўства. Узаемна чыстага і плённага. Падобнае на тое, што нарадзілася роднасловаўскай вясёлкай у той памятны сакавіцкі дзень. Нарадзілася, каб заўсёды яднаць “Роднае слова” са шчырымі прыхільнікамі беларускай мовы і літаратуры.

Таццяна Старасценка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ